УДК 821.112.2/.161.3-311.6
Наст. А.П. Шукаловіч, настаўнік беларуская мовы і літаратуры, магістр філал. навук (ДУА «Каладзішчанская сярэдняя школа»)
Навук. кір. А.В. Брадзіхіна, канд. філал. навук, дац. кафедры бел. літ. (ДУА "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны")

# МАСТАЦКІЯ ПЕРАСЯЧЭННІ ВАЕННАЙ ПРОЗЫ М. ГАРЭЦКАГА І Э.М. РЭМАРКА

Для разумення вайны ў яе існым абліччы недастаткова толькі архіўных запісаў альбо гістарычнай дакументацыі. Важным крытэрыем данясення да чытача маштабаў трагедыі з'яўляецца разгляд псіхалогіі вайны, якая ўвасабляецца ў характарах, лёсе і светаадчуванні яе непасрэдных удзельнікаў. І галоўнае тут – праўдзівасць апісанняў, дзе кожны радок – не фантазія, а ўласна ўбачанае, пераасэнсаванае, пражытае. Прыкладам непрыхаванай, праўдзівай літаратуры аб Першай сусветнай вайне з'яўляюцца творы славутага нямецкага пісьменніка Э. М. Рэмарка "На Заходнім фронце без перамен", "Вяртаннне", а таксама яркага прадстаўніка беларускай літаратуры М. Гарэцкага "На імперыялістычнай вайне", "Ціхая плынь", "Генерал", "Літоўскі хутарок", "На этапе".

Э. М. Рэмарк і М. Гарэцкі былі выхаваны ў небагатых сялянскіх сем'ях, што не магло не паўплываць на іх светаадчуванне. Э. М. Рэмарк так апісвае адносіны ў доме яго дзяцінства: "Мы в нашей семье никогда не были особенно нежны друг с другом, – это не принято у бедняков, чья жизнь проходит в труде и заботах". Выхаванцы вёскі, прадстаўнікі простага сялянства не паказваюць свае эмоцыі блізкім, яны звыклі праяўляць сваю прыязнасць дзеяннямі. Лявон Задума пакутуе ад гэтага, яму хочацца прынесці ў бацькоўскі дом радасць, але і без таго стрыманая сялянская эмацыянальнасць яшчэ больш грубее пад уздзеяннем ваенных умоў, дзе няма месца душэўным праявам. Затое творчая натура дазваляе персанажам бачыць прыгожае нават сярод хаосу і пачварнай рэчаіснасці, таму і ўражваюць іх малюнкі прыроды: "А на вуліцы – цёплае сонейка; пяюць без клопату птушкі, гудзяць у ліпняку пчолы. Усё – як усягды. Не даецца веры навінам".

І М. Гарэцкі, і Э.М. Рэмарк нярэдка гранічна лаканічныя, яны абмяжоўваюцца занатаваннем кароткіх слоў ці фраз, якія апісваюць хуткую змену падзей, асабліва ў перадачы батальных сцэн, што нагадвае пратакол ці рапарт з месца падзей: "Я кричу, подкатываюсь к нему, бью его коробкой, он ничего не замечает. Еще удар, еще удар".

Такі падыход дазваляе перадаць дынаміку батальных сцэн, іх непрадказальнасць, насычанасць кожнага моманту. Часам здаецца, што дзеянні адбываюцца настолькі хутка, што гэта не дазваляе дакладна прасачыць за часавай працягласцю бою.

Цэнтральнае месца ў творчасці Э. М. Рэмарка і М. Гарэцкага займаюць гуманістычныя ідэі. Менавіта таму тыпалагічныя сыходжанні паміж творамі М. Гарэцкага і Э. М. Рэмарка можна разглядаць праз прызму аспектаў, што заклалі аснову развіцця ідэй гуманізму XX стагоддзя. *Філасофска-антрапалагічны аспект* знаходзіць сваё адлюстраванне ў матыве "страчанага пакалення". Рэальныя памкненні юнакоў знайсці сваё месца ў свеце перакрэсліваюць ваенныя падзеі. Таму рэалізацыя сябе ў ролі, адрознай ад салдацкага статусу, становіцца амаль немагчымай, а наперадзе іх чакае пустэча: "Люди постарше крепко связаны с прошлым, у них есть почва под ногами, есть жены, дети, профессии и интересы; эти узы уже настолько прочны, что война не может их разорвать. У нас же, двадцатилетних, есть только наши родители, да у некоторых – девушка". Думкі герояў аб сустрэчы з бацькамі і блізкасці роднага дома выратоўваюць іх падчас бітваў, але ў рэальнасці вяртанне аказваецца разбуральным і яшчэ больш раніць скалечаныя душы. Персанажы раманаў М. Гарэцкага і Э. М. Рэмарка не знаходзяць сабе месца дома. Таму ўсё часцей ім сняцца франтавыя будні, усё больш думаецца пра саслужыўцаў і з такой ахвотай чытаюцца імі лісты з фронту.

Праведзены аналіз творчасці М. Гарэцкага і Э. М. Рэмарка сведчыць пра духоўнае падабенства творцаў – інтэлігенты ў першым пакаленні, яны атрымалі царкоўную адукацыю, выхоўваліся ў падобных умовах.

УДК 811.161.3’374.81

Вуч. З.А. Яркіна
Навук. кір. Т.А. Шуманская, намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце
(ДУА "Гімназія № 3 г. Салігорска)

## БЕЛАРУСКІЯ ЭЛЕКТРОННЫЯ СЛОЎНІКІ: СТРУКТУРНА-ЗМЕСТАВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ, ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

**Мэта і задачы даследавання.** *Мэта працы* – ахарактарызаваць сучасны стан беларускай камп’ютарнай лексікаграфіі і спрагназаваць магчымыя вектары яе далейшага развіцця.